*Слабадскі заслужаны аматарскі фальклорны гурт «Журавінка».*



віцця дасягнула ў Беларусі культура скрыпічнага суправаджэння спеваў: дзякуючы інструменталісту значна ўзрастала і паглыблялася выразнасць і маляўнічасць гучання песні, забяспечвалася драматургічная цэласнасць кампазіцыі. С. традыцыйна брала ўдзел у разнастайных па складзе інструментальных ансамблях, дзе яна спалучалася з хардафонамі — з 1—3 скрыпкамі, цымбаламі, басэтляй, балалайкай; мембранафонамі — бубнам або турэцкім барабанам; аэрафонамі — жалейкай, кларнетам, дудой; ідыяфонамі — гармонікам, трохвугольнікам. У ансамблях большага складу (С., цымбалы, гармонік; 2—3 скрыпкі і бубен; 3 скрыпкі, басэтля, турэцкі барабан; скрыпка, кларнет, гармонік, цымбалы, турэцкі барабан; С., цымбалы, кантрабас, бубен і інш.) яна выконвала вядучую, меладыйна-каларыстычную функцыю. Паступовае няўхільнае знікненне гэтага любімага народам інструмента зафіксавана ў 1980-я г.

*Літ.*: Никифоровский Н. Я. Очерки Витебской Белоруссии. 2. Дудар и Музыка // Этногр. обозрение. М., 1892. Кн. 13—14, № 2—3; Назина И.Д. Белорусские народные музыкальные инструменты: Струнные. Мн., 1982; Яе ж. Аб дыялектыцы традыцыйнага і новага: З гісторыі скрыпкі на Беларусі // Музычная культура Беларусі: праблемы гісторыі і тэорыі: Матэрыялы VIII Навук. чытанняў памяці Л.С. Мухарынскай (1906—1987), г. Мінск, 9 крас. 1999 г. Мн., 1999; Pietkiewicz Cz. Polesie Rzeczyckie // Pietkiewicz Cz. Kultura duchowa Polesia Rzeczyckiego: Materjały etnograficzne. Warszawa. 1938. Kn. 2.

*І. Дз. Назіна.*

**СЛАБАДСКІ ЗАСЛУЖАНЫ АМАТАРСКІ ФАЛЬКЛОРНЫ ГУРТ «ЖУРАВІНКА»** сельскага Дома культуры Лельчыцкага раёна. Заснаваны ў 1987, з 1992 народны, з 2002 заслужаны. Кіраўнік — Г.Сакалоўская. Удзельнікі гурта — носьбіты мясцовых песенных традыцый. У рэпертуары бел. нар. песні («Ой, чырачка, пташачка», «Зялёны сад», «Каравай, мой раю», «Ой, Іван, Іванечка», «Касіў казак сена» і інш.), нар. бытавыя танцы («Полька», «Цёмна ночка»), веснавыя карагоды і інш. Спяваюць пад акампанемент баяна, гармоніка. Паставіў абрады Каляды, Гуканне вясны, Жніво, Вяселле. Калектыў — удзельнік міжнародных фестываляў нар. танца «Палескі карагод» (г. Пінск, 1991), харэаграфічнага мастацтва «Сожскі карагод» (Гомель, 1997), фалькл. свята «Песні роднага краю» (г. Астрог Ровенскай вобл., Украіна, 1998), Рэспубліканскага свята «Дажынкі» (г. Нясвіж, 1998; Мазыр, 2001), фестывалю фалькл. мастацтва «Берагіня» (г.п. Акцябрскі, 2001). Выступаў у тэлепраграме «Запрашаем на вячоркі» з абрадамі Вяселле і Шчодрыкі.

*С. С. Авадок.*

**СЛАВІСТАЎ БЕЛАРУСКІ КАМІТЭТ** (БКС), навуковая арганізацыя пры Нац. АН Беларусі. Заснавана ў 1957 як арганізацыйны камітэт для падрыхтоў-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ